# ПСІХАЛАГІЧНАЕ РАЗВІЦЦЕ АСОБЫ СРОДКАМІ МАСТАЦКА-ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

М.З.Яноўскі

Шматлікія педагогі, псіхолагі і філосафы мінулага бачылі ў выхаванні і фарміраванні чалавека галоўную цэль мастацка-творчай дзейнасці. Цалкам відавочна, што разнастайныя віды мастацкай дзейнасці развіваюць асобу ў эстэтычных, маральных, пазнавальных адносінах, садзейнічаюць фарміраванню ў яе актуальнай і патэнцыяльнай актыўнасці, творчых адносін да працы, пашыраюць дыяпазон узаемадзеяння чалавека з навакольным светам. Пры гэтым мастацтва як бы канцэнтруе ў сабе разнастайныя магчымасці уздзеяння на унутраны свет чалавека, фарміруя пры гэтым пэўныя асабістыя адносіны і устаноўкі да навакольнага свету. Яно актыўна фарміруе ценнасныя арыентацыі асобы, яе густы, ідэалы, спецыфічнасць і патэнчаласць накіраванасці. Пры гэтым актыўнасць у мастацтве не вырашае пытанняў выпрацоўкі дакладных узораў паводзін чалавека у вызначаных сітуацыях і ў гэтым плане яго функцыі адрозніваюцца ад сацыяльна-рэгулятыўнай функцыі маралі або палітыкі. Яно фарміруе устаноўкі, ідэалы, накіраванне паводзін асобы ў цэлым, яе светаадчуванне, выконвае ролю сацыяльна-арганізуючага фактара.

Асабліва вялікае значэнне мастацка-творчай дзейнасці асобы для развіцця шматлікіх пачуццяў і эмацыянальнага патэнцыяла чалавека ў цэлым. Чым разнастайней гама пачуццяў чалавека, чым яна танчэй і змястоўней, тым больш востра чалавек рэагуе на свет, тым глыбей і шырэй суадносіцца ен са светам ў працэсе яго пазнання і стварэння. Выхаваўчае уздзеянне мастацтва вызначаецца тым, што праз вобразы твораў мастацтва раскрываюцца праўдзівасць і мана, дабро і зло, красата, яно выступае сродкам пазнання жыцця людзей, спосабам уваходжання ў розныя бакі жыццедзейнасці дарослых, разумення іх патэнчаных узаемаадносін.

Трэба падкрэсліць, што у псіхалагічнай і педагагічнай праблематыцы вывучэнню прыкладных пытанняў, раскрываючых якасна-колькасныя змяненні розных бакоў псіхікі чалавека ў працэсе актыўных заняткаў мастацка-творчымі відамі дзейнасці, надзя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лялася вельмі мала ўвагі.

У шэрагу педагагічных даследванняў паказана значнае павышэнне у навучэнцаў розумавай актыўнасці, колькасці арыгінальных асацыяцый, пасіленне матывацыі пры уводзінах у навучальны працэс для старшакласнікаў дысцыплін мастацка-творчага цыклу. Навучэнцы у класах з пасіленным праходжаннем дысцыплін мастацка-эстэтычнага цыклу значна перавышалі сваіх аднагодкаў з матэматычным ухілам навучання, а тым больш вучняў, займаючыхся па звычайнай праграме, па большасці параметраў, характарызуючых прадуктыўнасць і дынамічнасць мыслення.

У шэрагу даследванняў выяўлена магчымасць змянення рознымі відамі мастацка творчай дзейнасці супрацьпраўных установак у падлеткаў з асацыяльнай накіраванасцю паводзін.

Вывучэнне намі на працягу шэрагу гадоў уплыву музыкальна-харэаграфічнай дзейнасці на разнастайныя псіхічныя функцыі дзяцей рознага узросту выявіла, што у працэсе заняткаў у дзяцей актыўна развіваюцца псіхаматорныя функцыі, уласцівасці увагі, тэмп рэакцый, кінастэзічная пачуццевасць, самарэгуляцыя, здольнасць адэкватнага успрымання і ацэньвання часу.

У разглядаемым кірунку выключна вялікія развіваючыя магчымасці тэатральнай творчасці асобы і асабліва у фарміраванні камунікатыўных уменняў і культуры мовы, невербальных форм паводзін, самарэгуляцыі паміжасобавых адносін, самапазнання.

## ЦЭННАСНЫЯ АДНОСІНЫ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ ДА ВЫБРАНАЙ ПРАФЕСІІ

А.Б.Каганаў

Праблема вывучэння цэннасных адносін студэнтаў да выбранай прафесіі мае важнае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Цэнасныя адносіны да прафесіі з'яўляюцца значным элементам у структуры усведамлення асобы, робячым уплыў на інтэлектуальную і эмацыянальна-валявую актыўнасць, у прыватнасці, на паспяховасць вучэбнай дзейнасці.

Намі было праведзена эксперыментальнае даследванне цэннас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ